Такім чынам, спецыяльныя кафедры выконваюць значную ролю ў арганізацыі і правядзенні вытворчай практыкі студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры. Аднак вопыт работы кафедраў патрабуе далейшага ўдасканалення дзейнасці студэнтаў, выкладчыкаў, усіх зацікаўленых асоб у накірунку паляпшэння прафесійнай падрыхтоўкі будучых работнікаў бібліятэчных устаноў.

**Дзямешка Л.А.,** прафесар

## ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯТЭЧНЫХ СІСТЭМ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ).

На факультэце інфармацыйна-бібліятэчных сістэм Беларускага універсітэта культуры назапашаны значны вопыт работы, што станоўча ўплывае на якасць правядзення вытворчай практыкі. Засяродзім увагу на асобных арганізацыйных момантах.

Праграма вытворчай практыкі распрацоўваецца ў адпаведнасці са спецыялізацыяй студэнтаў (менеджэры інфармацыі бізнесу; бібліятэкары, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры; бібліятэкары дзіцячых бібліятэк і г.д.). Падрыхтаваныя вядучымі выкладчыкамі праграмы абмяркоўваюцца на ўсіх кафедрах факультэта. Заўвагі выпраўляюць члены савета па вытворчай практыцы. Савет, дарэчы, існуе ад часу заснавання нашай навучальнай установы.

На наступным этапе ідзе ўзгадненне дапрацаваных тыпавых праграм з базамі практыкі. З гэтай мэтай савет па вытворчай практыцы сумесна з дэканатам арганізуе абмеркаванне праграм з кіраўнікамі практыкі, вопытнымі, адказнымі спецыялістамі бібліятэк г.Мінска. На такіх нарадах, як правіла, выказваюцца слушныя парады, меркаванні, пажаданні кіраўнікоў бібліятэк—баз практыкі. Парады амаль заўсёды ўлічваюцца, праграмы практыкі яшчэ раз удасканальваюцца. Важна падкрэсліць момант унясення ў змест тыпавых праграм практыкі інавацыйных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадаў, індывідуальных змен паводле асаблівасцей бібліятэчнай работы пэўнай установы.

Заслугоўвае ўвагі інструктаж студэнтаў з удзелам кіраўнікоў практыкі ад універсітэта і бібліятэк, які арганізуе дэканат пры падтрымцы вучэбнага аддзела Беларускага універсітэта культуры.

Вучэбны аддзел рыхтуе да інструктажа неабходныя арганізацыйныя матэрыялы: загад рэктара па размеркаванні студэнтаў, дамоўленасці з базамі, накіраванні. Дэканат, выкладчыкі арыентуюць студэнтаў у арганізацыі, змесце, методыцы практыкі, накіроўваюць на якаснае выкананне заданняў, навукова-даследчай работы, выяўленне камунікатыўных рыс у прафесійных калектывах, дысцыплінаванасць і адказнасць. На працягу практыкі выкладчыкі Беларускага універсітэта культуры наведваюць базы з мэтамі дапамогі, кантролю.

Вынікі практыкі абмяркоўваюцца на базах на пашыраных нарадах. Удзельнічаюць у іх кіраўнікі, вядучыя спецыялісты канкрэтнай базы, выкладчыкі, студэнты. Пажаданні, меркаванні, заўвагі спецыялістаў і студэнтаў адлюстроўваюцца ў пратаколах па абароне практыкі; потым яны дадаюцца да справаздачы брыгады. У брыгаднай студэнцкай справаздачы адлюстраваны аб'ём і якасць заданняў, выкананых кожным практыкантам, брыгадай у цэлым; пададзены каментарыі, высновы кіраўнікоў практыкі. На падставе справаздач рыхтуецца агульная справаздача па факультэце. Яе абавязкова абмяркоўваюць спачатку на кафедрах, потым на савеце факультэта. Часта пры абмеркаванні выплываюць недапрацоўкі. Тут жа сумесна ўсімі членамі савета выпрацоўваюцца рэкамендацыі і прымаецца рашэнне. Працэс абмеркавання садзейнічае ўдасканаленню арганізацыі і зместу практыкі. Зацверджаная саветам ФБІС справаздача падаецца ў вучэбны аддзел.

Праведзены вышэй разгляд сведчыць пра вялікую работу і тую ўвагу, што надаецца на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм вытворчай практыцы студэнтаў. Вядома, такая работа падуладная толькі спецыялістам высокага класа,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія на працягу многіх гадоў працуюць у савеце па вытворчай практыцы. Гэта, напрыклад, дацэнты С.В.Зыгмантовіч, С.А.Паўлава, А.І.Усціменка.

Атрыманы вопыт работы дазваляе штогод аналізаваць недахопы, узніклыя на глебе змен навучальных установак, і выпрацоўваць прапановы, выказваць свае меркаванні, пажаданні. Спынімся на некаторых з іх.

Па-першае, настаў момант, калі сярод баз практыкі павінны быць установы рэгіёнаў краіны, не толькі сталіцы. У бліжэйшы час трэба будзе арганізаваць камандзіроўкі выкладчыкаў ФБІС у абласныя, раённыя цэнтры з мэтай базавых пагадненняў. Выязная практыка неабходная ў сувязі з размеркаваннем выпускнікоў, замацаваннем іх на рэгіянальных аб'ектах і ў сувязі з іх навуковай пераддыпломнай працай.

Па-другое, вучэбнаму аддзелу Беларускага універсітэта культуры патрэбна мець на ўвазе і ўліку розныя ўстановы інфармацыйнага профілю. Дзяржаўныя і камерцыйныя цэнтры, што здзяйсняюць апрацоўку, распаўсюджанне інфармацыі, маюць патрэбу ў спецыялістах вышэйшай адукацыі, згодныя прымаць студэнтаў на практыку, дзеля таго каб замацаваць іх на рабоце ў далейшым.

Па-трэцяе, на ФБІС пажадана мець камп'ютэрны клас са сваімі персаналам, паркам сучасных ПЭВМ, пакетам праграмных сродкаў, на якіх працуюць бібліятэкі Беларусі. Гэта дасць магчымасць удасканаліць змест вытворчай практыкі студэнтаў. Пры існуючым становішчы рэчаў яны знаёмяцца з праграмнымі сродкамі часцей падчас практыкі ў буйных бібліятэках.

Вырашэнне праблем, што ўзніклі на ФБІС, у гэтым навучальным годзе, на наш погляд, дазволіць удасканаліць вытворчую практыку — аснову падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ